# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

2 лютага 2024 г. № 44 г.Мінск

Аб узнагароджанні вымпелам ”За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны“

У сувязі са святкаваннем 80-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама ў мэтах увекавечання подзвігу воінаў Чырвонай Арміі, працоўных, партызан і падпольшчыкаў, здзейсненага імі пры абароне і вызваленні беларускіх гарадоў і іншых населеных пунктаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, п а с т а н а ў л я ю:

1. За мужнасць і стойкасць, праяўленыя абаронцамі беларускіх гарадоў і іншых населеных пунктаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, узнагародзіць вымпелам ”За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны“:

гарадскі пасёлак Асвея;
горад Асіповічы;
горад Баранавічы;
горад Дзяржынск;
горад Дзятлава;
горад Калінкавічы;
горад Любань;
гарадскі пасёлак Обаль;
горад Чавусы.

2. Фінансаванне расходаў на выраб вымпелаў ”За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны“ і ганаровых грамат да іх ажыццявіць у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце ў 2024 годзе Міністэрству абароны на ўтрыманне Узброеных Сіл.

3. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

Для правовых актов

18